Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

ВОЛЯ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 5 | Вільня, Серада 28-га сакавіка 1928 г. | Год 1

У дзесятыя ўгодкі.

25 сакавіка 1918 года Рада Беларускай Народнай Рэспублікі ў Менску на ўрачыстым паседжаньні абвесьціла акт незалежнасьці Беларусі.

Многа прайшло часу, пакуль у думках даўнейшых адраджэнцаў усталілася патрэба гэтага акту. Працуючы ў умовах, немагчымых для разьвіцьця хоць якое вольнае думкі, бачучы, як высілкі другіх народаў ня толькі недавалі нічога пазытыўнага ў гэтым сэньсе, а канчаліся звычайна поўным правалам, шыбеніцамі ды ссылкамі ў далёкі Сібір — беларускія адраджэнцы ў сваіх папярэдніх пастановах маглі асьмеліцца хіба толькі на форму аўтаноміі ў межах Расеі, ці ў лепшым выпадку на форму, „фэдэрацыі народаў Усходняй Эўропы“.

Рэвалюцыя 1917 года перавярнула наагул ўсё ўверх дном і, што раз паглыбляючыся, паставіла на чарод дня таксама і далёка сягаючую на той час, проста немагчымую датуль, думку аб незалежнасьці Беларусі. Гэта было завяршэньне разьвіцьця, найвышэйшы, кульмінацыйны пункт усяго г. зв. беларускага адраджэнскага руху, які ў формуле незалежнасьці ясна выказаў новы ідэал, які з гэтага часу стаўся падставай ўсяе далейшае працы ўсіх беларускіх грамадзкіх і палітычных працаўнікоў. Пачаўся нібы новы пэрыяд беларускага руху, *пэрыяд гаспадарствена-творчы*.

Цяпер мы сьвяткуем дзесятыя ўгодкі гэтага акту. Мусім акінуць вокам гэты час, зрабіць падрахунак працы (наколькі дазволіць газэтная стацьця), праглядзець, у які бок кіравала жыцьцё гэтую працу, якія чыньнікі зрабілі найбольш у сэньсе зьдзейсьненьня гэтага ідэалу—каб прадбачыць і прабег працы на будучыню.

Ідэал незалежнасьці прыняты ўсімі г. зв. шчырымі беларусамі за падставу дзеяльнасьці, але сутнасьць гэтага ідэалу разумелася рознымі кірункамі—розна. У той час, як правыя беларускія групіроўкі бачылі ў незалежнай Беларусі звычайнае дасюль гаспадарства выразна вызначанага буржуазнага тыпу з усімі адзнакамі яго: бюрократыяй, буржуазіяй і г. д. з увядзеньнем толькі афіцыяльнай беларускай мовы, як новага фактару — жыцьцё пакіравала радыкальную частку беларускага грамадзянства на стварэньне іншага ідэалу незалежнасьці, чым апісаная вышэй ідылія. Гэта ідэал—*Беларусі працоўнай* і шлях да яе зьдзейсьненьня—*саюз з працоўнымі масамі іншых нацыянальнасьцяў*, (правыя групіроўкі гэтым шляхам лічаць „згоднае сужыцьцё і паразуменне між сабой усіх беларускіх групаў і рашучую барацьбу з іншымі нацыянальнасьцямі, асабліва з пануючай польскай у нас“, бяз розьніцы клясаў, што бязумоўна ня шкодзіць ім рабіць блёкі з буржуазіяй іншых нацыянальнасьцяў і плясьціся ў хвасьце буржуазіі і нацыі пануючай).

На ўсходзе ідэал працоўнай Беларусі зьдзейсьніўся. Паўстала Незалежная Беларуская Дзяржава, факту істанаваньня якой ніхто ня можа запярэчыць.

Іншая справа на Заходзе. Самая думка аб незалежнасьці, якой-бы то ня было—ўважаецца бязумоўна за здраду той дзяржаве, у межах якое апынулася тая ці іншая частка беларускага народу. Але пакуль гэтыя думкі знаходзяцца на ступені ідылічных пажаданьняў—уважаюцца за пэўную забаўку і не выклікаюць рэпрэсыяў з боку ўлады. Розныя Янкі Станкеўчыкі, Ярэмічы ды навет Умястоўскія хай бавяцца сабе, скольківхочуць—можна яшчэ й па плячу патрапаць і „памагчы“. Іншая справа масавы рух, з якім зьвязана радыкальная частка беларускай інтэлігенцыі. Але тут справа пастаўлена на іншы грунт.

Пераконаныя ў шчырасьці і рэальнасьці лёзунгу ўсіх працоўных масаў аб поўным самавызначэньні народаў—беларускія радыкалы прышлі да выснаўку, што толькі супольная барацьба за інтарэсы працоўных усіх нацыянальнасьцяў дасьць у выніку перамогі таксама і зьдзейсьненьне ідэалу незалежнасьці працоўнай Беларусі. Пачалася *супольная барацьба ўсіх працоўных дзяржавы за супольныя правы і інтарэсы наагул.*

У такім выглядзе думка радыкальнай часткі беларускага грамадзянства, ня толькі змагла ўсталіцца, а больш таго—зрабілася *знамем, каля якога пачаў гуртавацца ўвесь беларускі працоўны народ*, які з галіны ідылічных пажаданьняў перанёс справу ў галіну *канкрэтнай барацьбы* за зьдзейсьненьне выстаўленага ідэалу.

Вось да якіх вынікаў прыходзім мы ў дзесятыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці! Ідэал незалежнасьці ёсьць непадзельная частка агульнага ідэалу працоўных. Думка выкоўваецца ў жыцьці, у барацьбе. Але іншая думка тут і не магла выкавацца. Ні для кога не зьяўляецца сакрэтам, што заўсёды і ўсюды нацыю, як такую, рэпрэзэнтуюць паасобныя клясы. У сярэднія вякі нацыі рэпрэзэнтаваліся арыстакратыяй, „нацыянальныя адраджэньні“ 19 стагодзьдзя былі нічым іншым, як адраджэньнем буржуазіі паасобных нацыяў. У наш дваццаты век найбольш перадавымі, найбольш жыцьцёвымі клясамі, якія выступаюць на арэну жыцьця — ёсьць клясы работнікаў і сялян. Яны будуць прадстаўляць нацыі і таму беларускі рух ня можа быць іншым у сваім выніку, як толькі рухам працоўным. Думкі правых групіровак далёкія ад запраўднага жыцьця і таму адпадуць самі сабой, як ня жыцьцёвыя, ня рэальныя.

На парозе дзесятага году беларускія працоўныя гушчы стаяць ужо з ясна выпрацаваным ідэалам, асьвечаным лічнымі ахвярамі і *бязумоўнай перамогай на выбарах* (ніколі ня лічым выбары паразкай, бо вынікі ў нашых умовах не выяўляюцца лікам выбраных паслоў, а перавагай галасоў пры страшных проста ўмовах навет за скасаваныя сьпіскі), ідэалам — ісьці *толькі разам з працоўнымі іншых нацыянальнасьцяў, змагацца толькі за агульныя працоўным інтарэсы* і толькі тады перамога будзе забясьпечанай.

Працэс Сялянска-Работніцкае Грамады.

Сёмы дзень працэсу.

Пасьля адзінаццаці дзён перарыву на час выбараў у Сойм і Сэнат працэс узноўлены 12 сакавіка, ад 12 гадз. Старшыня суда абвясьціў, што пратакол прабегу суда да перарыву блізкі да канца, і што хутка староны змогуць пазнаёміцца з ім. Пратакол займае 56 старонак друку.

Пакуль пачаць дапытваць пакліканага на гэты дзень сьведку Д. Пятроўскага, старшыня прапануе дапрасіць сьв. Я. Бушмана, які толькі-што вышаў з турмы, дзе адбываў адміністрацыйную кару за стараньні перайсьці граніцу, за ўдзел у нелегальным сходзе, за ўхіленьне ад вайсковай службы; сьв. быў сэкрэтаром гуртка Грамады ў Стаўпецкім павеце. Калі яго затрымалі на граніцы, знайшлі пры ім сяброўскі білет Грамады і больш ніякіх дакумэнтаў пры ім ня было.

Судзьдзя Борэйка: А ці сьведка ў часе пераходу граніцы меў польскі пашпарт? Сьв ня меў, бо забралі яго бальшавікі, калі быў на савецкім баку ў 1925 г. Больш нічога важнага сьведка ў справу ня ўносіць.

Далей ідзе дапрос сьв. Доміника Пятроўскага, кіраўніка аддзелу бясьпечнасьці ваяводзкага ўраду. Гаворыць ён аб камуністычным руху, да якога адносіць і „Грамаду“. Успамінае пастановы III Зьезду ПКП (Польскай Камуністычнай Партыі), што адносяцца да арганізацыі вызвольнага руху сярод беларусаў. Рух гэты меў прыгатаваць сялянства да камуністычнага ладу. Зьезд П.К.П., праклямуючы адарваньне тэрыторыяў, прызнаў за патрэбнае ўтварыць партызанку. Даказвае, што „Грамада“ зусім не хацела апекавацца беларускім нацыянальным рухам і кіраўнікі Грамады ня цікавіліся беларускасьцяй яе. Сьв. бярэцца далей аналізаваць праграму „Грамады“. Супроць гэтага выступае абарона. **Адв. Сьмяроўскі:** Сьведка гаворыць, як экспэрт, а не як сьведка. Абарона сама патрапіць аналізаваць праграму Грамады і бяз сьведкі.

Суд радзіцца ў гэтай справе, пасьля чаго старш. прапануе сьв. гаварыць далей.

Далей сьв. цьвердзіць, што праграма Грамады на першы плян выстаўляе сацыяльныя мамэнты. Абяцанка аб тым, што праца Грамады будзе весьціся ў рамках канстытуцыі — ня была датрымоўвана, бо пры працы было шмат адміністрацыйных караў. Падкрэсьлівае сьв. і міжнародны характар Грамады, бо жыды бралі ўдзел у дэманстрацыях, ладжаных Грамадой, як напр. у часе дэманстрацыі ў салі „Helios“ п. Тарашкевічу рабілі авацыю. Кажа, што шмат выдатных сяброў КПЗБ былі ў Грамадзе, што выступленьне Грамады 14 сьнежня перад Лукішкамі мела вялікае значэньне для Комінтэрну, бо савецкія газэты пісалі аб гэтым. У такім духу сьв. далей гаворыць аб шкоднасьці Грамады.

Пераходзячы да абгаварваньня працы Грамады ў войску, сьв. просіць суд, каб зрабіць загад, каб суд адбываўся пры зачыненых дзьвярох. Суд просьбу прыймае паўгадзіны часу справа вядзецца пры зачыненых дзьвярох, пасьля чаго абвяшчаецца перарыў на абед. Пасьля абеду суд ішоў пры зачыненых дзьвярох.

Восьмы дзень працэсу. Дзень гэты быў прысьвечаны дапросу сьведкаў. 6 з іх адказываюць з вастрогу, бо сядзяць як абвінавачаныя па 102 арт. К. К.

Не зьявіліся сьв. адв. Андрэеў, (прабывае ў Луцку на судзе) і Вільчынскі.

Уваходзіць сьв. Бах, рэфэрэнт Мініс. Унутраных Спраў, па справах „вывротовага руху“. Паказаньні яго апіраюцца на вестках высланых з паасобных ваяводзтваў у Міністэрства, тым больш, што сьв. ня робіць уражаньня чалавека беглага ў справах, а навет робіць уражаньне чалавека мала інтэлігентнага. Гаворыць аб сутычнасьці Грамады з КПЗБ.

Сьв. Бандрэвіч Макар адзін з арыштаваных за належаньне да КПЗБ (Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі) заперэчвае ён перадусім, што належыў да КПЗБ, кажучы, што належаў толькі да Грамады. Нязгоднасьць пяпераршніх паказаньняў з паказаньнямі ў сьледчага судзьдзі, калі сьв. прызнаўся, што быў сябрам ячэйкі КПЗБ у Сініцы, высьвятляе тым, што тады яго біла паліцыя, дык, каб ўратаваць сябе ад далейшых пабояў, змушаны быў прызнацца да таго, што яму падказвалі.

На пытаньне судзьдзі Барэйкі, чаму ўступіў у Грамаду, адказвае, што ўсе ўступалі ў Грамаду дык і ён уступіў, тым больш, што Грамада была левай партыяй, партыяй працоўнага люду.

Сьв Гедройць, б. войт Забрэскай вол., Валожынскага пав., кажа аб тым, што ўплывы Грамады спрычыняліся да ненармальнай аплаты падаткаў.

Адв. Бабянскі. А ці з рацыі гэтага ня было якіх забурэньняў? Сьв. не. **Старшыня суда.** Ці ня было забурэньняў у часе прымусовага сьцягваньня падаткаў? Сьв. Адпор быў роблены майму заступніку. Справа гэта ўжо ў судзе. Штось падобнае было і з сэквэстратарам.

Судзьдзя Едзэвіч. Ці падаткі былі тады надта высокія? Сьв. Не. Людзі праівалі грошы, а падаткаў плаціць не хацелі. **Адв. Этынгер.** Ці сьведка сам ня меў нядоімкі? **Старшыня.** На гэта пытаньне сьведка можа не адказываць. Сьведка з гэтага і карыстае. **Пракурор Калапскі.** Што пан чуў аб прыгатаваньні да паўстаньня? Сьв. Казалі людзі, што можа быць дрэнна. Марыя Гашкевічанка (кандыдатка сьпіску № 37 у 62 вокр.) цешылася, што Грамаду зьліквідавалі, казала, што калі б не зьліквідавалі, дык вясной было-б праліцьцё крыві.

Сьв. Хлябовіч—войт Валожынскай вол. гаворыць аб проціпадаткавай агітацыі. Спатыкаўся у волясьці з такімі адказамі: „што ты цяпер возьмеш, калі ўжо прыехаў беларускі сэквэстратар“. Далей гаворыць сьведка аб беларускай прэсе, пасыланай на вёску бясплатна.

Абв. Рак-Міхайлоўскі. Якія часопісі прысылаліся, грамадаўскія ці розныя. **Сьв.** розныя і ўсе дарма.

Далей сьв. Вінцэнт Кіслы, абвінавачаны за належаньне да КПЗБ. Як і Бандровіч, адмаўляецца ад сваіх паказаньняў у сьледчага судзьдзі, бо даў іх пад націскам паліцыі. Суд сцьвярджае разьбежнасьць у паказаньнях ранейшых і цяперашніх. Адмаўляецца ад таго, што належыў да КПЗБ і сцьвярджае, што належыў да Грамады. **Старшыня.** Чаму належыў да Грамады? **Сьв** жыцьцё змусіла. Толькі Грамада бараніла нашы інтарэсы. **Старшыня.** А КПЗБ? **Сьв.** Ня ведаю. **Сьв. Вінцэнт Казакевіч** так сама абвінавачаны ў тым, што належыць да КПЗБ. Ад закідаў гэтых адмаўляецца і, як папярэднія два кажа, што ў сьледчага судзьдзі даў паказаньні, што належыў да КПЗБ толькі таму, што пры „баданьнях“ паліцыя біла. Тая самая гісторыя паўтараецца пры паказаньнях **сьв. В. Шаўлюка, Пётры Шаўлюка, Тодара Высоцкага і Мацея Залеўскага.** Усе яны абвінавачваюцца ў тым, што належалі да КПЗБ і ўсе цяпер адмаўляюцца ад гэтага і ад сваіх паказаньняў у сьледчага судзьдзі, сцьвярджаючы, што паліцыя іх біла, чаму яны і змушаны былі даць такія паказаньні. Адзін з іх навет (ня помню толькі каторы) зрабіў як бы рэчовы доказ сваіх паказаньняў: выняў хустачку з кішані, харкануў кроўю і сказаў, што гэта насьледкі баданьняў і турмы, што ён сухотнік і што праз некалькі месяцаў яго ня стане, а таму ня мае чаго больш баяцца. **Сьв. Пшэзьдзецкі** кам. пастарунку ў Валожыне. Гаворыць аб акцыі Грамады і КПЗБ і аб награмаджэньні аружжа. **Адв. Гонігвіль.** Колькі аружжа знойдзена ў Грамадаўцаў? **Сьв.** не памятую. **Адв. Гонігвіль.** Якое аружжа знойдзена: рэвальвэры... стрэльбы... бомбы... а можа і гарматы? **Старшыня** калі ласка такіх пытаньняў не задавайце, гэта ж не балаган. **Адв. Гонігвіль** тлумачыцца. **Адв. Сьмяроўскі.** Скуль пан ведае, што знойдзены пулямёт належыў да Грамады? **Сьв. Гэтага** я ня цьверджу.

Сьв Сьлізь кажа, што быў на канфэрэнцыі КПЗБ у Маладэчне. Там чуў, што Тарашкевіча называлі нацыянальным камуністам. Кажа, што часьць грошы, сабраных на палітычных вязьняў, пераказаў КПЗБ. **Адв. Сьмяроўскі.** Чым пан займаецца? Сьведка, маю краму. **Адв. Сьмяроўскі.** Маеце справу? Сьв. за рабунковы напад сядзеў ад 16/V 1923 г. да 18/V 1925 г. **Адв. Сьмяроўскі.** А ў справе прыналежнасьці да КПЗБ справы ня маеце, бо прызналіся-ж вы, што належалі да КПЗБ, сьведка выкручваецца. Урэшце выясьняецца, што сьв. быў канфідэнтам паліцыі. Пасьля адчытаньня паказаньняў адсутнага сьв. Вільчынскага—камэнданта паліцыі Валожынскага пав. паседжаньне на гэты дзень зачыняецца.

Дзевяты дзень працэсу. Дзень гэты пачынаецца дапросам віленскіх адвакатаў: Чэрніхава, Міцкевіча і Родзевіча, як сьведкаў. Адвакаты гэтыя ў свой час баранілі беларусаў у палітычных працэсах. Ходзіць аб тое, каб устанавіць, ці была ў гэтых адвакатаў спэцыяльная канфэрэнцыя, маючая на мэце ўстанавіць таксу за абарону абвінавачаных і арганізаваць абарону лепш, пад кіраўніцтвам адв. Родзевіча, які меў назначаць іншых адвакатаў дзеля абароны ўсіх спраў Грамады і Грамадаўцаў. Перад дапросам успомненых сьведкаў варшаўскія адвакаты, уваходзячыя ў склад абароны падсудных, дэман-

стратыўна накладаюць салю суда. З паказаньняў сьв. Адв. Чэрніхова высьвятляецца, што на канфэрэнцыі ён ня быў, але ведаў аб існаваньні таксы. Адв. Міцкевіч кажа, што быў на канфэрэнцыі ў адв. Родзевіча, здаецца, што была ўстаноўлена такса ганарараў, здаецца, што была надзелена праца між адвакатамі тэрыторыяльна. Прапазіцыя аб канфэрэнцыі выйшла здаецца ад б. п. Сабалеўскага. Сьв. сэнатар Багдановіч займае шмат часу, гаворыць аб расколе Белар. Пасольск. Клюбу, з якога і паўстала Грамада. Раскол стаўся на аснове рознага разуменьня справы працы Пасольскага Клюбу.

Грамадаўскія паслы лічылі незадавальняючай працу на соймавым грунце і дамагаліся працы па-за Соймам. Жалезны капітал клюбу пасьля разлому быў падзелены прапарцыянальна. У справе Беларуск. Банку ў Вільні, кажа, што складкі сябраў былі ў суме 50 зл. Даход меў банк асабліва з транзакцыяў перказаў ў Рызе. Да гэтага часу справы банку стаялі дрэнна. Коўш камуністым быць ня мог. Зваў яго, як чалавека энэргічнага і практычнага.

Праф. Раўз. Тварцамі банку былі і Ярэміч і Кс. Станкевіч, чаму яны пазьней выступілі? Сьв. Паўсталі непаразуменьні. Адв. Астроўскі як больш энэргічны застаўся.

Сьв. адв. Родзевіч гаворыць, што была ўмова аб абароне з Сабалеўскім, але сэдзьні кальныя канцылярыі дзеля абароны Грамадыцаў ня было. Сьв. Бліэьнянскі (жыд) б. вучань Белар. Гімн. пасьля працаўнік Цэнтр. Сэкр. Грамады. Вышаўшы з Гімназіі чытаў беларускія кніжкі і вельмі зацікавіўся беларускім рухам, чытаў усе белар. газэты. Уравіў працаваў па ракаваньня, што толькі Грамада ёсьць ідэйнай партыяй. Астатнія беларускія партыі кіруюцца кар'ерызмам. Паказаньні сьв. сьв. Карпа, Э. Залкінда, В. Грыца і інш. нічога цікавага ня прынясьлі.

10-ты дзень працы. Першы даваў сваю справаздачу у гэты дзень працы Аляксандровіч, заступнік Камісара Ураду на м. Вільню. У даволі доўгай прамове „схарактарызаваў ён дзейнасьць „Грамады", кладучы націск на прэсавую старану (быў у той час рэфэрэнтам прэсавага аддзелу г. б. цэнзарам), ачытваючы амаль-што ўсе артыкулы сканфіскаваных газэт, як: „Нашай Справы", „Нашага Голасу", „Нашай Долі" і г. д.; пры гэтым зазначыў, што некаторыя з рэдактараў былі амаль-што анальфабэтамі. Калі пры гэтым Рак-Міхайлоўскі запытаўся яго, на якой падставе, ці з якіх даных называе сьведка рэдактараў анальфабэтамі, ён адказаў: „подпіс рабіў такое ўражаньне". Падсудны Рак-Міхайлоўскі выясьняе, што ўсе вымененыя праз сьведку рэдактары, былі сярэдняй адукацыі, як Шыла, Касяк, які ў цяперашнія часы мае права быць навет вучыцелем гімназіі. (Вось і падпішыся ты дзенебудзь нявыразна, або мей благі характар!— *Рэд.*).

Сьведка І. Ліндэ, падае, што ён зьяўляецца работнікам на шклянай гуце, у якой працавала 300 чалавек, з якіх 70 проц. было беларусаў, што большая палова ўсіх работнікаў належала да „Грамады". Сам ён паляк і запісаўся туды „дабравольна, праз нікога не намаўляны". Што тры разы атрымаў ён ад свайго гуртка газэты, але бачыў падчас сходкі, як зьбіраліся грошы ў шапку, за якія, выясьняе падсудны Акінчыц, і былі высыланыя газэты. На сходцы, на якой ён быў, прамаўлялі Мятла і Тарашкевіч. Ен зразумеў з прамовы, што хадзіла аб школьніцтва і беларускую „народовосьць".

„Найцікавейшым" можа будзе „зэзнане" Студніцнага, дырэктара мясцовага архіву ў Вільні. Найбольш у яго зазначылася пэўная тэндэнцыйнасьць, пэўнае ўкрытае жала, скіраванае проці беларускага руху, а найбольш да асобаў Яна (які ўжо памер) і Антона Луцкевічаў, з якім (Антонам) лучылі яго калісьці прыязныя адносіны. (Прыяцелем быў яго тады, як знаходзіліся ў аднолькавых варунках: калі большая частка Польшчы, а таксама і Беларусі былі пад ярмом расейскага царату; цяпер, калі варункі зьмяніліся... зьмяніліся і адносіны, бо супольная ідэя калісь застала зрэалізавана аднооа адной стараны—*Рэд.*). Абкідываючы брудам Луцкевіча, называе яго найцямнейшым індувідуумам, (не заўсёды праўдзівай бывае прыказка: „ляжачага ня б'юць"), і нічога дзіўнага, што гэта выклікае агульны пратэст абаронцаў (адвакатаў), а адвакат Генігвіль у абурэньні выклікнуў: „to—bezczelność!".

Сьведка закідае Луцкевічу, што ён надчас нямецкай акупацыі працаваў за грошы нямецкага гэнэральнага штабу, выдаючы сьпярша лацінікай, а пасьля кірыліцай („бо мы беларусы, а не беларусы, сказаў мне тады Луцкевіч" — словы сьведкі) беларускую часопісь „Гомаи", маючы дырэктывы, што да кірунку гэтае газэты, ад гэтага ж штабу.

Адв. Сьмяроўскі: ці ведаець сьведка, як гісторык, газэту „Godzina Polska", якая выходзіла ў Варшаве за нямецкія грошы, званая папулярна „гадзіна" і ці не фігуравала ў ёй прозьвішча „Студніцкі".

Сьведка ня ведае, за чые грошы гэтая часопісь выходзіла, а што да прозьвішча „Студніцкі", выяўляе, што гэта быў яго брат.

Адв. Сьмяроўскі: „ці закідвалі брату сьведкі тое, што закідвае цяпер сьведка Луцкевічу"—старшыня суда Аўеянка ўхіляе гэтае пытаньне.

Падсуд. Луцкевіч складае пасьля выясьненьне, што паперу і фарбы давала ім (Ластоўскаму, Яну і Антону Луцкевічам) за грошы нямецкая Preszestelle; па паўгодзьдзе немцы дазволілі выдаваць „Гомаи" кірыліцай (адначасна выдавалася газэта і лацінікай; карэктарам пры лацініцы быў сьпярша Аляхновіч, а пасьля Я. Станкевіч, на якога карэктара немцы давалі 75 мар.; іншыя выдаткі былі пакрываны, дзякуючы дапамозе беларускага грамадзянства).

Сьведкі Аврэйцэвіч і Стэповіч, працаўнікі друкарні ім. Фр. Скарыны паказваюць, якія газэты і брашуры ў гэтай друкарні друкаваліся, колькі вынасіў поўны наклад 1.000 экз.; пры гэтым Стэповіч зазначае, што найчасьцей замаўляў Бурсэвіч, які і аплачваў рахункі і што часта былі залегласьці з выплатай грошы.

Сьведкі: Дойліда і Шыла (былы рэдактар), прыслалі ў пісьме свае паказаньні. Апошні зазначае, што Луцкевіч падаваў у газэту толькі навуковыя артыкулы.

Сьведку Грышкевіча закідае пракуратар пытаньнямі, на якія ён адказвае, што як ён быў студэнтам у Празе (Чэхія), прыяжджаў туды Тарашкевіч, але паміж студэнтамі не выступаў, ня быў на ніводным студэнцкім сходзе; ён-жа (Грышкевіч) бачыўся з ім зусім прыватна.

Сьведка Лапінская, адміністратарша друкарні „Рах" падае, што поўны наклад на 2.000 экзэмпляраў газэты „Narodny Zwon" каштаваў ня больш 160 злотых.

Сьведка д-р Дварчанін Ігнат. На запытаньне судзьдзі „што пан ведае ў гэтай справе", адказаў: „ведаю, што дзеецца крыўда, дзеля таго, што сядзяць тутака тыя людзі..." за што старшыня заклікае яго да парадку. Судзьдзі: „пан цяпер ёсьць паслом, з якой лісты"? З лісты № 39 у Навагрудчыне. Ці гэта ліста грамадаўская? Гэта сьпісак: „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў".

Далей гаворыць, што ён вучыўся ў Унівэрсытэце ў Празе Чэскай, дзе ўваходзіў у лік студэнтаў беларусаў, яна налічыла 110 сяброў. Па прыезьдзе з Прагі ў Вільню ўступіў у „Грамаду", бо бачыў на чале яе людзей, „якія былі запраўднымі павадырамі беларускага руху", якіх ведаў раней і верыў ім. Уступіў у Грамаду і таму яшчэ, што сюды, як да легальнае партыі, належаў амаль ня ўвесь беларускі народ і што ідэалёгія Грамады ня была ў супярэчнасьці з яго ўласнымі грамадзкімі пераконаньнямі.

На запытаньні судзьдзі, ці ведаў у Празе студ. Цьвяткова, Бабровіча і Макоўскага — сьведка адказвае, што ведаў добра. Цьвяткоў належаў зразу да Беларуск. Студэнцкага Саюзу, потым перайшоў у Расейскі Камітэт. У Вільні бачыўся толькі з Макоўскім. Падсуд. Рак-Міхайлоўскі пытае сьведку, калі жыў (Дварчанін) у яго, то якой мовай гаварыла яго сям'я і ці меў ён асабістага сэкрэтара, на што Дварчанін адказвае: толькі беларускай, а сэкрэтара ніякага ня было.

Сьв. Кайзэрмахэр, кіраўнік друкарні Клецкіна і І. Левін — уласьнік друкарні (Нямецкая вул. 22). Апошні зазнае, што тут друкаваліся ад пачатку існаваньня „Грамады" газэты, прамовы паслоў і адзін раз партыйныя білеты. Пры гэтым кошты за 1.000 экз. газэты вынасілі 140 зл., далейшыя 1.000, толькі 20 зл. (папера і клішэ даваліся заказчыкамі). У 1926 г. друкаваліся 1.000 эгзэм. газэты, пасьля 2.000—2.500.

Сьв. Кузьма Крук, радны места Вільні, былы скарбнік цэнтральнага гуртка „Грамады". За пасаду грошы не атрымоўваў, а працаваў ганарова. У справе выбараў да мястовай Рады прызнаецца, што яго запрасілі жыдоўскія і некаторыя работніцкія арганізацыі прыняць удзел у выбарчай акцыі, на што ён згадзіўся і быў сэкрэтарам Агульнага Камітэту; рэпрэзэнтаваў агул Беларусаў, якія ішлі на выбары пад адным сьцягам; пры гэтым тлумачыць нязгоднасьць паміж паказаньнямі ў судзьдзі сьледчага і тут.

Сьв. Лукашэвіч, сэкрэтар Віленскае Беларускае Гімназіі, былы сябра Нагляднае Рады Беларускага Банку гаворыць аб гімназіі, рэмонтах, якія там адбываліся, хто калі быў дырэктарам, што гімназія ўтрымоўвалася (і ўтрымоўваецца) з вучнёўскіх аплатаў, з субвэнцый Т-ва Беларуск. Школы і ахвяраў. Будучы сябрам Нагляднае Рады Банку ад яго заложэньня, падае, што фундацыйным падставовым капіталам Банку былі ўклады паслоў. Галоўнымі дахадовымі пазыцыямі Банку былі транзакцыі пераказавыя з Банкам у Рызе. Пазычкі мог атрымоўваць той, хто выказаўся маемасьцю (пасьведчаньнем). Высокасьць пазычак даходзіла да 80 дал., пры гэтым часта былі такія, калі ў Банку адчуваўся брак грошаў.

Аб Астроўскім гаворыць, як аб чалавеку багатым і што ён ад 1924 г. быў дырэктарам Белар. Гімназіі ў Вільні. Сям'я яго жыла ў Радашкавічах да 1926 г., куды ён езьдзіў падчас вакацыяў; у 1926 г. пераняслыся яны ў калёнію калеёвую (вярсты 2 ад Вільні).

Сьв. Маразовіч, выдавец „Маланкі", у некалькіх словах, гаворыць ён а „Маланцы": што выходзіла эгзэмпляраў ад 1.500 да 3.000, і што кошты аднаго выданьня былі ад 400 да 450 зл.; ганарары за аўтарства былі вельмі малыя. На пытаньне адв. Эгтінгера, ці добра цяпер расходзіцца „Маланка", дастае адказ: „нішто, расходзіцца добра, зыск заўсёды ёсьць, бо інакш не магла-б існаваць". Аб падсуд. Астроўскім гаворыць, што яму вельмі падабалася „Маланка" і што ён (Астроўскі) напісаў навет калісь сатыру „Банк у Маскве". У справе гэтае сатыры падсудны Астроўскі дае выясьненьне.

Сьв. інж. Нэканда-Трэпка, вучыцель Віл. Белар. Гімназіі і польскай тэхнічнай школы, быў дырэкт. Віл. Бел. Гімназіі ад 1922 г. да 1924 г. Характэрызуе ён братоў Луцкевічаў, як ідэйных працаўнікоў на полі Беларускага Адраджэнскага руху. Жылі яны ў нэндзы і ў нэндзы памёр брат падсуднага Антона, Ян Луцкевіч, хоць меў свой уласны музэй вялікай вартасьці. Гэтыя людзі стаялі высока, што да маральнасьці: былі чыстымі і шчырымі. На грунце беларускага руху зьяўляюцца яны вельмі заслужонымі, бо яшчэ ў 1900 г. у Маскве побач з іншымі прычыніліся яны да стварэньня „Беларускай Сацыялістычнай Грамады", адзінай з першых арганізацыяў, якая адкрыта стала на грунце беларускім. Праз увесь час, аж да 1926 году вёў падсуд. Антон Луцкевіч культурнаасьветную працу і не належаў да ніводнай з партыйных арганізацыяў.

Сьв. Рашатаў (наборшчык у друкарні Левіна, Нямецкая вул. 22) належаў да „Грамады". За яго працу ў друкарні выплачвала заўсёды адміністрацыя тэй газэты, што друкавалася ў друкарні. Друкавала там свае друкі і „Грамада", якая ня вельмі рэгулярна выплачвала яму, а таксама і яго калегам за працу, ня гледзячы на тое, што ў тыя часы ён атрымоўваў многа менш, чымся ў гэтым годзе, так што яны некалькі разоў дамагаліся, каб павялічыць ім стаўку.

Сьв. Іван Савіцкі, вучыцель Віл. Белар. Гімназіі, старшыня Белар. Камітэту, сьведчыць, што „Белар. Т-ва помачы ахвярам вайны" атрымала з Менску ад „Чырвонага Крыжа" ў 1926 — 1927 г. сьпярша 4.000 зл., а пасьля 15.000 злот. Да „Грамады" не належаў.

Сьв. Война́кова Люда., адміністратарка часопісі „Наша Справа", пэнсія месячная яе выносіла 100 зл. На пытаньне падсуд. Рак-Міхайлоўскага, колькі было ў другой палове 1926 г. падпісчыкаў на гэтую газэту, падае, што было 8.000.

Сьв. Война́ Антон гаворыць пра кражу, якая адбылася ў рэдакцыі пры Віленскай вул. 12, пам. 6, у якой мае падазрэньне на Закрэўскага, экспэдытара гэтай-жа рэдакцыі. Наагул характэрызуе яго, як ня вельмі пэўнага чалавека, у якога: „крадуць кажух, — калі купляе вясеньняе пальто, крадуць пальто, калі купляе вясной гумовы плашч".

На гэтым закончыўся 10-ты дзень працы.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Сойм і Сэнат скліканы на 27 сакавіка.

22 сакавіка Прэзыдэнт Рэчыпаспалітай падпісаў два дэкрэты—аб скліканьні Сойму і Сэнату на першае паседжаньне ў дзень 27 сакавіка. Урачыстае адчыненьне абедзьвух палатаў парляманту адбудзецца, як пішуць газэты, у Замку Прэзыдэнта, які сам адчыніць паседжаньне прывітальнай прамовай.

Трэба думаць, што да сьвятаў яны здолеюць толькі арганізавацца, г. е. — зробяць выбары прэзыдыуму, камісіяў і г. д.

У Варшаве пачалося „парляманцкае жыцьцё".

„Газ. Варш." піша, што ў Варшаве — у зьвязку з блізкім адчыненьнем парляманту—пачалося парляманцкае жыцьцё.

Пэпээсаўскі клюб ужо нараджаецца ўсьцяж. Рыхтуюцца і клюбы эндэцыі і Пяста і інш.

Кракаўскі „Кур'ер" паведамляе, што 23 сакавіка адбыўся сход клюбу ППС—з удзелам усіх 63 паслоў і 10 сэнатараў, на якім адбыліся выбары клюбавых уладаў. — Старшынёй клюбу выбраны пас. Марэк, віцэ-старшыні—паслы Недзялкоўскі і Жулаўскі, і сэн. Познэр. Клюб ППС пастанавіў высунуць на становішча старшыні соймавага кандыдата пас. Дашыньскага.

— Паседжаньне поўнага клюбу „Супрацоўніцтва з урадам мае адбыцца, як піша „Газ. Варш", 27. III.

Гандлёвы балянс за м. люты.

Па аблічэньнях Галоўнага Статыстычнага Ураду, гандлёвы балянс Польшчы за месяц люты г. г. прадстаўляецца гэтак:

А. Рэйзін.

Ксёндз.

У суботу падвечар местачковыя жыды заўсёды выходзілі на вуліцу, як-бы праважаючы суботу, а ў царкве і касьцёле пачыналі званіць, абвяшчаючы сьвята.

Званы напаміналі жыдом аб заўтрашнім рынку і некаторыя з мінамі астраномаў задзіралі галавы ўвыш, каб паглядзець, ці добрая пагода будзе і ці вялікі рынак.

Рынак быў вельмі патрэбны жыдом. Усё мястэчка жыло толькі з яго. Ня толькі крамнікі і гандляры, але краўцы і шаўцы. Бо, праўду кажучы, што можна ад жыда зарабіць.

Рынкі заўсёды былі вялікія. Толькі ў дрэнныя пагоды сяляне з далёкіх вёсак не прыяжджалі і трэба была задавольвацца тады малым рынкам.

Праўда, да 12 гадзіны крамы і корчмы былі зачынены. „Набажэнства ідзе ў царкве, гаварыў соцкі — ня можна"! Але дрэннага нічога не рабілі, калі які крамнік, або карчмар таргаваў пару грошай да 12 гадз.; хоць соцкі і быў пабожны чалавек, але курыў люльку і піў. Дзеля гэтых дзьвёх рэчаў ён часам і наракаў на рэлігію і глядзеў праз пальцы на тое, што рабілася ў часе набажэнства (малітвы).

Чаго ня зробіць соцкі за пачку махоркі і трошкі гарэлкі?

Местачковыя жыды былі вельмі задаволены сваім соцкім і нядзеляй і дзякавалі Богу, што ён стварыў праваслаўных і каталікоў, якія маюць асобныя сьвятыні для малітвы, куды яны прыяжджаюць маліцца і купляць патрэбныя рэчы.

Аднойчы ў суботу падвечар, калі местачковыя жыды навыходзілі на вуліцу глядзець на неба, ці добрая будзе пагода, адзін жыд, Хаім раптам, сьмяючыся, сказаў:

„Я клянуся, што ў касьцёле сяньня ня звоняць".

Чаму-бы ён не званіў, спытаў крамнік?

Усе настаражылі вуха і праз хвіліну пастанавілі:

„Але, у царкве звоняць, а ў касьцёле не".

І запраўды чуўся толькі царкоўны звон, які, здавалася, быў задаволены, што яго чыста праваслаўны „бім бом" не мяшаецца з касьцельным звонам, каторага ён ня любіў.

— „Тут ня ўсё у парадку! — сказаў адзін, каторы ўвесь час глядзеў на неба і цешыўся, што заўтра будзе добрая пагода— я гатоў падыйсьці к касьцёлу і паглядзець.

Па-што табе ісьці, вось ідзе Анупры, ён католік, дык мы яго спытаем.

Анупры, высокі з вялікімі вусамі селянін, праходзіў міма.

— Добры вечар! затрымаў яго адзін.

— Не гавары толькі яму глупства, папярэдзіў яго другі, палякі трошкі ганаровыя...

— Ня бойся,—супакоіваў яго той і зноў зьвярнуўся да Анупрыя:

— Куды ідзе ягомасьць? напэўна ў касьцёл?

Анупры, уздыхнуўшы, махнуў рукой.

Жыды пачалі чакаць адказу ад Анупрыя.

— Няма касьцёлу, няма ксяндза..., сумна казаў Анупры.

— Што, што? ўскрыкнулі ўсе разам.

— Сяньня ўначы забралі ксяндза, а касьцёл запячаталі, апавядаў Анупры.

За што? Спыталі ў адзін голас жыды.

— За што? За тое, што нас прыцясьняюць—адказаў каталік — ксёндз маліўся ў сваёй мове, а на яго зрабілі данос.

— Жыды спачувалі Анупрыю, але ня ведалі, як яго пацешыць.

Анупры з апушчанай галавой пайшоў, а жыды, пачэсываючы патыліцу, маўчалі.

— Вы ведаеце, што мы найбольш адчуваем адсутнасьць ксяндза... адазваўся нехта раптам.

— Гэта значыць, што ў нядзелю будзе малы рынак, бо ўсе каталікі паедуць у другое мейсца.

— Гэта — то праўда! паддакнуў адзін і закусіў язык.

— Кепская справа, прабурчэў другі?

— Як гэта! Чаму ён такі дурань і кажа малітвы на такой мове, на якой па закону забаронена?

— Ведаеце, — з радасьцю ўскрыкнуў нехта,—нам ужо лепей, чым ім, мы можам маліцца ў сваёй мове і ніхто нам не забараняе.

— Добра, добра, сказаў хтось злосна, але паглядзім, што ты будзеш рабіць заўтра, калі ўсе каталікі паедуць у другое мястэчка, а ты і граша не заробіш...

— Так, так, гэта то ты праў!

Як раз ў гэты час сярод жыдоў вяліся спрэчкі за рабіна, але гісторыя з ксяндзом закруціла ім галавы і яны забыліся аб сваіх асабістых справах.

Злучыла іх цяпер адна мэта: ксёндз! Яны мусяць старацца, каб быў ксёндз! Калі не, то мястэчка загіне. Што нядзеля, то рынак усё меншы і меншы, усе каталікі едуць кудысь у другое месца.

— Што будзе? спытаў аднойчы адзін жыд у суботу пасьля малітвы. Трэба-ж пастарацца ксяндза... У нядзелю не таргуюць і дзесятай долі, што калісьці таргавалі.

— Ен праў! З таго часу, як няма ксяндза, я нічога не зарабляю, — падтрымаў яго нехта.

— Жартачкі! Усе каталікі едуць у другое мястэчка. Трэба-ж нешта рабіць.

— Заяву да губэрнатара! крыкнуў адзін!

— А архірэю—крычалі другія.

— У сэнат, бубнілі іншыя.

— Трэба раскашаліцца, а што калі-б рэвізор або прыстаў?

— Нарэшце ішлі навет да рабіна.

Мястэчка мела манію: ксяндза!

Калі хто небудзь прыяжджаў, то зараз апавядалі яму, што вельмі дрэнна ім жывецца, бо няма ксяндза.

— На што Вам ксёндз? пытаецца здзіўлена прыехаўшы.

— На што? Гэта-ж за яго ў нас рынак заўсёды малы. Не зарабляюць нічога.

— Ага! пачынае разумець новапрыбыўшы і згаджаецца з імі, што ня добра без ксяндза.

— Але што-ж Вы робіце?

— Вось у тым то і няшчасьце, што мы нічога ня робім.

Жыды охалі, енчылі і сумавалі па ксяндзу.

Свае асабістыя спрэчкі яны даўно забылі.

Пераклала з жыдоўскага Э. З.

Агулам прывезена 379,362 тонаў (тона = 61 пуду) на цану 270,378,000 злотых.

Вывезена 155,610 тонаў, цаною 197,823,000 злотых.

Пасыўнае сальдо (канечны вынік) гандлю месяца лютага раўняецца 72,555,000 зл.

У параўнаньні з данымі мес. студзеня г. г., даныя лютага паказваюць зьмяншэньне прывозу на 785,000 злотых., а вывазу на 20,591,000 зл.

Як бачым з гэтага, гандаль Польшчы нешта закульгаў у лютым.

Праект бюджэту Польшчы.

Газэты падалі быццам ужо зацьверджаны ўрадам лічбы бюджэту Польшчы на 1928—1929 г., які будзе ўжо 27 сакавіка ўнесены ў Сойм.

Агульная сума даходаў прадбачана ў лічбе 2.525.703,000 зл.; сума выдаткаў — 2.478.370.000 зл., гэткім чынам бюджэтны лішак мае быць каля 47 мільён.

Асаблівасьцяй новага бюджэту зьяўляецца, як пішуць газэты, вельмі значныя сумы, асыгнаваныя на капітальныя выдаткі,— ці на разбудовы новых даходавых і наагул патрэбных для краю прадпрыемстваў і установ.

Новы карны закон.

У 33 нумэры „Дзенніка Уставаў Польскай Рэспублікі“ апублікавана распараджэньне Прэзыдэнта Рэспублікі аб новых карных законах, прадпісаньнях, уводзячых гэтыя законы і аб даразных законах. Першае з гэтых распараджэньняў уваходзіць ў жыцьцё з днём 1 ліпня 1929 году і ўхіляе існуючыя да таго часу тры карныя законы: расейскі, нямецкі і аўстрыяцкі.

Ці не палепшыцца часам палажэньне нашае прэсы пры новых законах?

Міжнародны „Кангрэс міру“ ў Варшаве.

Па пастанаўленьні Міжнароднага Бюра Міру ў Жэневе і па запросінах з боку Польшчы, XXVI Міжнародны „Кангрэс Міру“ адбудзецца ў Варшаве, 25—29 чэрвеня г. г. Тэмай абрад Кангрэсу будуць, між іншымі, наступныя справы: разбраеньне, эканамічнае паразуменьне народаў, актуальныя справы, як становішча ў Кітаі, запытаньне Пам'эроны і інш. На гэтым Кангрэсе мае быць больш 200 учасьнікаў з заграніцы, сярод якіх будуць вядомыя і ўплывовыя палітыкі.

Па Кангрэсе адбудуцца візыты ў Кракаў, Львоў і Закапанае, дзе Управы гэтых мест з'арганізуюць адпаведнае прыняцьце.

Вось як — багатым і ў будні баль і сьвята!

Польска-літоўскія перагаворы.

Польскі ўрад, як ведама, згадзіўся на прапазіцыю Вальдэмараса — распачаць перагаворы 31 сакавіка ў Кэнігсбэргу (Крулӗўцу). На чале дэлегацыяў будуць стаяць самі міністры загран. спраў: Залескі і Вальдэмарас. Тэлеграма „Пат“, кажа, што перагаворамі вельмі зацікавілася прэса ўсіх краёў: шмат карэспандэнтаў з Эўропы, навет з Амэрыкі прыедуць у Кэнігсбэрг.

Але—ці перагаворы прывядуць да паразуменьня, аб гэтым напрыклад нямецкая прэса кажа вельмі сумліўна.

„Франкф. Газэта“, як перадае „Пат“, думае, што Вальдэмарас і ў часе вусных перагавораў будзе прадаўжаць тую-ж „дыскусію“ (спрэчку) з Залескім, якая адбывалася дагэтуль шляхам лістоўных нотаў, дый якая не давяла ні да якога пазытыўнага рэзультату. Адначасна газэта падчырківае, што літоўскі ўрад „распачаў быццам новую эру — усё больш зблізкаючыся да Нямеччыны“. Літва ўсё больш разумее значэньне Нямеччыны для сябе—як палітычнае падтрыманьне ў Лізе Нацыяў, таксама і гаспадарчае: толькі ў сувязі з Нямеччынай Літва здолее апанаваць свой эканамічны крызіс. Але варункам гаспадарчага ўздыму Літвы зьяўляецца адчыненьне сплаву па Нёмну, у якім асабліва заінтарэсавана Нямеччына. Дзеля таго пэўнае паразуменьне з Польшчай ляжыць—як у інтарэсе Літвы таксама і ў інтарэсе Нямеччыны. Дзеля таго апошняя вельмі цікавіцца перагаворамі, якія маюць адбыцца ў Кэнігсбэргу.

Рэха выбараў.

Есьць весткі, што паўнамоцнікі камуністычнага сьпіску на Гарадзеншчыну выступілі з жаданьнем скасаваць выбары ў Сойм у гэтай Акрузе. Падобна з такой-жа самай акцыяй мае выступіць і „Stron. Chłopskie“.

— У Лідзкай выбарнай акрузе зложаны тры пратэсты проці выбараў у Сойм. Сьпісак № 10 і № 18 уносяць аб уняважненьні выбараў, па поваду іх уневажненьня, а сьпісак № 3 з поваду нефармальнасьцяў пры падлічэньні галасоў.

Паўнамоцнікі сьпіскаў № 2 (ППС) і № 10 (Строн. Хлоп.) на Наваградчыну — зложылі пратэст з поваду нефармальнасьцяў у часе выбараў, але ўневажненьня выбараў не дамагаюцца.

Арыштаваньне былага пасла ППС.

Былы насол ППС, Валіцкі, які разам з супрацоўнікамі Лунінецкага Сэйміку надужываў сэйміковыя фінансы, а потым выступаў некалькі разоў у Нясьвіжскім павеце, скампрамітаваўшыся аканчальна, разазлаваўся на нашы „Крэсы“ і пакінуў іх. Доўгі час аб ім нічога ня было чутно. Аж вось цяпер „Robotnik“ падае, што Валіцкага арыштавалі ў Кракаве на вуліцы і аддалі ў распараджэньне пракуратуры. У апошнія часы Валіцкі займаў пасаду сэкрэтара Саюзу Гарнякоў у Катавіцах.

Але можам думаць, што крук круку вока ня выдзеўбе.

Зачыненьне ўкраінскай „Просьвіты“ ў Ровенскім павеце.

Як падае „Жэчпосполіта“, па загаду Ровенскага староства была зроблена рэвізія ў некалькіх аддзелах „Просьвіты“ на тэрыторыі гэтага павету. У часе рэвізіі сцьверджана „проста нячуваны ўзрост камунізму“ (кажа „Жэчпосполіта“) і надужыцьце арганізацыйнымі маемасьцямі.

Пасьля гэтага староства паведаміла Павятовую Управу „Просьвіта“, што пастанавіла зачыніць 33 аддзелы „Просьвіты“ за дзейнасьць, нязгодную з статутам гэтай арганізацыі.

Разам з гэтым зачынена аж 14 бібліатэкаў-чытальняў!

Відаць—у страха вочы вялікія!

Падвышка цэн на каменны вугаль.

Вугальныя прамыслоўцы Верхняй Сілезіі выступілі з дамаганьнем падвышкі цэн вугальля на 20 прац. Меншай падвышкі ня хочуць, з пераканаиньня, што яе можа не хапіць дзеля ўтрыманьня балтыйскіх і скандынаўскіх рынкаў, бо гэтай падвышкі ня выстарчыць, каб пакрыць страты, панесеныя пры вывазе, асабліва ў зьвязку з англійскай канкурэнцыяй. Збыт-жа вугальля ў Польшчы вельмі малы, каб мог пакрыць гэтыя расходы.

„Każdy święty ma swoje wykręty“!

Бясплатная дэкарацыя.

Варшаўскі „Głos Prawdy“ падае, што аднаго вечара на электрычных дротах Зялёнай вуліцы (у Варшаве) быў вывешаны чырвоны штандар з антыдзяржаўнымі надпісамі. Гэтую „камуністычную аздобу“ зьняла паліцыя і вядзе даходжаньне ў кірунку вышуканьня гэтых працавітых камуністычных дэкаратараў.

Усюды гэтыя камуністыя!

Пажар фабрыкі ў Беластоку.

У фабрыцы Зыльбэрмана выбух з невядомых прычынаў пажар, ад якога вельмі хутка згарэў увесь будынак. Згарэла 16 ткацкіх варстатаў і многа іншых машынаў. Агулам страты раўняюцца 250.000 злотых. Вынікам пажару 70 работн. страціла працу.

Самабойства начальніка Лідзкай турмы.

20 г. месяца стрэлам з рэвальвэру застрэліўся начальнік Лідзкай турмы Марэк. Марэк быў пацягнуты да судовай адказнасьці за службовыя надужыцьці.

Першая візыта ката ў Беластоку.

Нядаўна а 5 гадзіне раніцы выступіў у Беластоку першы раз кат.

Першай яго ахвярай быў Уладыслаў Стаськевіч, засуджаны на сьмерць за забойства ўрадоўца Дырэкцыі Дзяржаўных лясоў у Белавежы Станіслава Гадомскага і белавежскага купца Вайнштэйна.

Кат прыехаў з Варшавы з памочнікам. Кат ехаў у вагоне 1-ай клясы, а памоцнік 2-ой клясай.

У часе экзэкуцыі прыгавораны захоўваўся зусім спакойна і прасіў не завязваць вачэй.

Кат быў апрануты ў чорны фрак, цыліндар, белыя рукавічкі і ў чорнай ядвабнай масцы.

Зусім—папанску!

Калі Стаськевіч завіс, павешаны памочнікам, кат падбег і адным ўдарам ў шчаку зламаў яму карак, вынікам чаго была мамэнтальная сьмерць.

Гэта і ёсьць адзіная функцыя ката пры экзэкуцыі.

Па выкананьні яе кат скінуў рукавічкі каля ног павешанага.

Заграніцай.

Японска-радавыя перагаворы ў справе падзелу ўплываў у Манджурыі і Манголіі.

Токіо „ПАТ“. Адна з японскіх газэтаў падала сэнсацыйную вестку аб тым, што японскі ўрад вядзе з радавым паслом Караханам сэкрэтныя перагаворы ў справе паразуменьня ды падзелу ўплываў у Манджурыі і Манголіі, падрыхтоўваючы такім шляхам грунт да распачацьця адкрытых перагавораў у тэй-жа справе. З гэтай справай быццам злучана справа японскай пазыкі для Радаў. Японскае міністэрства заграничных спраў рашуча запярэчвае гэтай вестцы.

Англійскія кансэрватары адкінулі 7-гадзінны дзень працы работнікаў пад зямлёй.

Англійскі парлямант адкінуў 154 галасамі проці 127—праект закону, унесены Работніцкай Партыяй, меўшы ізноў увясьці 7-гадзінны дзень працы ў капальнях. Проці праекту выступіў міністар капальняў Кінг, які заявіў, што 8-гадзінны дзень працы быў прыняты толькі год таму назад—пад націскам неабходнасьці (пасьля стратаў, прычыненых забастоўкай вуглякопаў). Міністра падтрымаў другі кансэрватар Клорры, які заклікаў парлямант адкінуць праект, які заб'е аканчальна англійскую вугляную прамысловасьць, якую ўжо пачала забіваць канкурэнцыя польскага вугальля, пазбавіўшага ўжо Англію яе швэдзкіх рынкаў.

Выбары ў нямецкі парлямант.

Нямецкі парлямант дажывае апошнія дні. 31 сакавіка мае адбыцца апошняе паседжаньне Рэйхстагу.

На канфэрэнцыі прэм'ера з прадстаўнікамі клюбаў першы заявіў, што канчальна ўрад не назначыў яшчэ дня новых выбараў, але найбольш падобна да праўды, што гэта будзе дзень 20 траўня.

Справа амністыі ў Нямеччыне.

Карэсп. „Кур. Варш.“ піша з Бэрліну, што сярод палітычных групаў парляманту ўсьцяж ідуць спрэчкі аб тым, у якіх разьмерах тасаваць амністыю (дараваньне кары) за палітычныя праступленьні, якая мае быць абвешчана—з мамэнту распачацьця прадвыбарнай кампаніі. Прадстаўнікі „каталіцкага цэнтру“ выказаліся наагул проці ўсялякай амністыі; рэшта партыяў маюць апрацаваць узаемна-выгадны кампраміс. Але сацыялдэмакраты рашуча выказаліся проці таго, каб да нацыяналістаў-забойцаў тасавалася поўная амністыя, згаджаючыся толькі на пэўнае злагоджаньне кары. Нацыяналісты-ж на гэта не згаджаюцца. Дык кампраміс пакуль што не дасягнуты.

Паварот Гішпаніі і Бразыліі ў Лігу Нацыяў.

На апошняй сэсіі Рады Лігі Нацыяў пастаноўлена—зьвярнуцца да Гішпаніі і Бразыліі з просьбай вярнуцца ў склад сяброў Лігі Народаў. На гэтае запрашаньне ўжо адказаў гішпанскі ўрад, прымаючы з удзячнасьцю запрошаньне і згаджаючыся на яго—„без усялякіх варункаў і засьцярогаў“. Як ведама, Гішпанія два гады таму назад вышла з складу Лігі абражаная тым, што ёй не далі сталага месца ў Радзе Лігі, як вялікай дзяржаве. Але і цяпер у сваім адказе гішпанскі ўрад падчырківае, што — уваходзячы зноў у склад Лігі, Гішпанія — аддае Агульнаму Збору Лігі справу вызначэньня Гішпаніі адпаведнага месца ў Радзе, — каб зрабіць найбольш карыснай яе працу ў Лізе, прыняўшы пад увагу спэцыяльнае палажэньне Гішпаніі, як вялікай дзяржавы, захаваўшай нэйтральнасьць у часе вялікай вайны і—яе творчую ролю у „гісторыі цывілізацыі“.

Бразыльскі ўрад пасьпеў толькі яшчэ паведаміць ветліва аб атрыманьні запрашэньня.

Злова анархістаў проці Мусоліні.

У Парыж прыехаў сам міністар справядлівасьці Італіі Рокко—у зьвязку з галоснай справай забойства фашыста Саворэльлі. Прыезд гэты выклікаў сэнсацыю. Бо-ж ані сам забойца, ані яго супольнікі ня схоплены дагэтуль францускай паліцыяй, хоць прозвішча забойцы ўжо ведама. Забойца Алуізо Паван выканаў прысуд шырока распаўсюджанай проціфашыстаўскай арганізацыі ў Францыі, якая складаецца з вельмі лічных тутака італьянскіх анархістаў-эмігрантаў. На чале гэтай арганізацыі анархістаў стаіць прафэсар філязофіі Луіджы Бэрнары (італьянец), які і зьяўляецца, як думаюць, галавой усяе проціфашыстаўскай акцыі ў Францыі. Быццам паміж гэтым Бэрнары і Саворэльлі былі нейкія „фінансавыя справы“ і сэкрэты. Дык пад націскам Бэрнары „суд анархістаў“ загадаў Павану забіць Саворэльлі.

Так падае справу і матывы забойства такая прэса, як „Дзен. Віл.“ у № 63, адкуль бяром заметку.

Справа эльзаскіх аўтанамістаў.

30 сак. мае распачацца ў м. Эльзасе вялікі працэс эльзаскіх аўтанамістаў; абвінавачаньне іх кажа аб імкненьні да адарваньня ад Францыі, аб карыстаньні грашмі з Нямеччыны і г. д. Падсудных усяго 20 асоб, сярод іх галоўныя павадыры аўтанамічнага руху. Справа працягнецца некалькі тыдняў.

Турцыя мае ўвайсьці ў склад Лігі Нацыяў.

На чэрвеневай сэсіі Рады Лігі Нацыяў мае таксама ўрачыста запрасіць увайсьці ў склад Лігі і Турцыю, як толькі што зрабіла гэта — з Гішпаніяй і Бразыліяй. Турцыя быццам таксама жадае мець сталае месца ў Радзе Лігі, ставячы гэта варункам свайго ўваходу ў склад Лігі. На верасьнёвым Агульным Зборы Лігі мае адбыцца гэты ўваход Турцыі, якая пэўне-ж будзе выбрана ў Раду, на месца Кітаю, які канчае свой тэрмін.

Новая кантрабанда ваенных матэрыялаў.

Югаслаўскія ўлады затрымалі на граніцы транспарт, які ішоў — з Італіі ў Румынію. Транспарт выклікаў падазрэньне. Затрыманыя вагоны пастаўлены на запасны шлях—пад асаблівую ахову.

Толькі-што адгучэў скандал з кантрабандай ваенных матэрыялаў з Італіі ў Вэнгрыю, якім займалася Рада Лігі Нацыяў на апошняй сэсіі. Але Мусоліні ня ўнімаецца.

Літоўская афіцыяльная прэса аб перагаворах у Кэнігсбэргу.

Афіцыяльны орган літоўскага ўраду „Літоўск. Рэха“ піша:

„Літва хоча нармальных адносін з Польшчай — ня менш, як самі палякі, але нармальныя адносіны могуць існаваць толькі ў нармальным палажэньні рэчаў. Дык калі палякі згодзяцца стварыць такое нармальнае палажэньне паміж Польшчай і Літвой, тады нармальныя адносіны зараз-жа ўложацца самі сабой, з чаго мы, літвіны, будзем так цешыцца, як ніхто іншы. Але, нажаль, палякі ані думаюць аб навароце да нармальных адносін. Толькі разоў ужо мы вялі перагаворы з палякамі—у Вільні, Коўне, Кальварыі, Сувалках, Варшаве, Брюсэлі, Жэнэве, Капэнгагэне, Лугано і Рызе, але толькі адзін раз дасягнута было паразуменьне ў Сувалках дый то падпісаны там дагавор праз два дні быў безцэрэмонна зламаны палякамі. Дык дзіва, што мы ня можам пазбавіцца сумліву адносна да вынікаў новых перагавораў.

Вялі мы ўжо іх сто разоў, можам спрабаваць і 101-шы раз, можа што і выйдзе. І так далей...

У канцы афіцыёз піша: „Палякі павінны ведаць, што ім ня ўдасцца ашукаць нас ды змусіць да прызнаньня існуючага палажэньня. Літоўцы будуць усімі сіламі бараніць свае правы ўсімі спосабамі“.

Літоўская армія перайшла на мірнае палажэньне.

Газэты даносяць, што літоўскі ўрад пастанавіў, звольніўшы ген. Жукаўскаса, не назначаць на яго месца новага „галоўнакамандуючага“ літоўскай арміі — дзеля таго, што з прычыны скасаваньня „стану вайны“ з Польшчай — літоўская армія перайшла на мірнае палажэньне.

Бюджэт Літвы.

Прэз. Літоўскай Рэспублікі зацьвердзіў бюджэт Літвы на 1928 г. — у разьмеры 250 мільёнаў літаў. Бюджэт пасьля зацьверджаньня прэзыдэнтам — адразу ўваходзіць у жыцьцё.

Увага Рэд. Гэтым нарушаюцца асноўныя правы народнага прадстаўніцтва.

Рэпрэсіі ў Літве ня спыняюцца.

22 III ПАТ. Бэрлінскае агенцтва данясло з Коўні, што ваенны суд ізноў засудзіў 6 прыхільнікаў Плечкайтыса (сацыял дэмакратаў), абвінавачаных у падрыхтаваньні „замаху“, — на 6 гадоў катаргі кожнага...

Што робіцца ў Румыніі.

Кракаўскі „Кур. Штодзен.“ зьмяшчае карэспанд. з Румыніі, рысуючую добра палітычнае палажэньне краю — у зьвязку з барацьбой партыяў за ўладу і—сталай небясьпекай, пагражаючай — як з Усходу так і з Заходу. — Бяром з яе найбольш цікаўныя факты. Пасьля сьмерці караля Фэрдынанда Румынія ўсьцяж знаходзіцца ў стане хваляваньня. Праўна існуе кароль, але ён мае ўсяго 6 гадоў. Есьць Рэгэнцыйная Рада, але яна падзелена ўнутры, дык ня мае ніякай улады. Есьць „пракляты бацькам“ сын Фэрдынанда Кароль, які жыве заграніцай, але—рвецца ў край на трон, вядучы ўсьцяж агітацыю ў краі. Фактычную дыктатуру трымае ў краі ў гэткіх варунках урад. Пакуль на чале яго быў такі дасьледны палітык, як Ян Братыяну, дгэюль яго „лібэральная партыя“ мела ўладу бясспрэчна... У ліпні 1927 г. урадавая партыя рашуча перамагла на выбарах. Але Братыяну памер у лістападзе. Яго наступнік родны брат унасьледаваў па нябошчыку толькі яго прозьвішча, але не таленты і досьведы. Дык ад таго часу палітычнае жыцьцё Румыніі ідзе вельмі небясьпечным шляхам.

„Рада“ ня мае ніякага аўтарытэту. Прынц Кароль усьцяж агітуе сярод сялянства і арміі, дзе расьце лічба яго прыхільнікаў. Дык—з дня на дзень набліжаецца хвіліна замаху, — дый ня толькі проці ўраду, але і проці сучаснай вярхоўнай улады.

Лібэральная партыя, страціўшы ўсялякую папулярнасьць, трымаецца гвалтам. Лібэралы захапілі ўсе становішчы ў краі выціснуўшы ўсе партыі, дый пазбавіўшы іх сяброў усіх месцаў... Але праціўная партыя „сялянская“, як паказвае назоў, апіраецца на сялянства. Гэтая апазіцыйная партыя зложылася з двух дагэтуль розных, гэткім чынам апазіцыя аб'ядналася. Пасьля гэтага барацьба за ўладу завастрылася страшэнна.

22 сакавіка—дзень вельмі важны, паваротны ў ходзе падзей у краі. Бо ж — аб'яднаная „нацыянальна-сялянская партыя“ пасьля сьцягу маніфэстацыяў сваей сілы—мітынгаў, зьездаў, дэманстрацыяў,—пастанавіла — адклікаць усіх сваіх паслоў з парляманту, абвяшчаючы гэтым агульны байкот існуючых уладаў ў краі — заканадаўчай і выканаўчай.

У адозьве да народу ўсе паслы „народна-сялянскай партыі на чале з павадыром Маніў заявілі, што адгэтуль падымаюць рашучую актыўную барацьбу з урадам, якую ня спыняць, пакуль урад ня выйдзе ў адстаўку. У адозьве аднача сна заклікаўся ўвесь румынскі народ — каб высылаў сваіх дэлегатаў у м. Альба-Жулія на вялікую ўсенародную маніфэстацыю.

Альба-Жулія, гэта места, маючае асаблівае значэньне ў бліжкай гісторыі Румыніі: тутака адбылося „злучэньне“ адданых саюзьнікамі Румыніі зямель з апошняй; тутака каранаваўся Фэрдынанд каралём „Вялікай Румыніі“.

Цяжка прадбачыць, што можа выйсьці з гэтага „ўсенароднага сабраньня“.

Лібэральны ўрад, які мае ў парляманьце большасьць, мае ўсю адміністрацыю краю ў сваіх руках, хаця ня мае апоры ў шырокіх масах сялянства, ствараючага вялізарную большасьць насяленьня краю, не перастрашыўся, як кажа карэспандэнт „Кур. Штодз.“, ані байкоту парляманту, ані гэтай маніфэстацыі. Міністар унутраных спраў Дука заявіў, пасьля выхаду „сялянскіх“ паслоў з парляманту, што—„гэты выхад не адаб'ецца на палітыцы ўраду—бо-ж гэткія чыны апазіцыі—не навіна, — паўтараліся ўжо дзесяткі разоў гэтай партыяй. Урад будзе рабіць сваё. Сойм будзе рабіць сваё“. Але сам карэспандэнт піша, што—нявядама, што можа быць з усіх гэтых падзей.

Наша хроніка.

Сябрам Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні. Управа Белар. Каапэратыўнага Банку ў Вільні паведамляе, што, згодна пастановы Наглядная Рады і Управы Банку ад 9 сакавіка г. г. і на аснаваньні § 34 Статуту, адбудзецца звычайны агульны Сход сяброў Банку 2 красавіка 1928 г. у 4 гадзіны папаўдні, у памяшканьні Банку (Вільня, Віленская 8).

Парадак дня:

1) Адчыненьне і выбары Прэзыдыума Сходу.
2) Адчытаньне пратаколу папярэдняга Агульнага Сходу.
3) Справаздача Управы аб дзейнасьці Банку за 1927 г.
4) Справаздача Наглядное Рады.
5) Адчытаньне пратаколаў рэвізый.
6) Стварэньне рэзэрвага капіталу на пакрыцьцё страты балянсавай.
7) Бюджэт расходаў і плян працы на 1928 год.
8) Справа зьмены § 9 і 14 Статуту Банку.
9) Давыбары сяброў Наглядное Рады.
10) Бягучыя справы. Управа.

Аб скарбоначным зборы, ладжаным Камітэтам Помачы ахвярам вайны 21-га сакавіка 1928 г. Камісія для аблічэньня збору ахвяр 21 сакавіка 1928 г. на карысьць Беларускага прытулку, які утрымліваецца Камітэтам Беларускага Т-ва Помачы пацярпеўшым ад вайны і знаходзіцца ў Вільні на Вострабрамскай вул. № 9.

Скарбонак была раздана зборшчыкам усяго трыццаць дзевяць, пачынаючы ад № 1 да № 39 уключна. Пры раздачы скарбонак зноўдзена, што вечкі апошніх, як належыць, былі прымацаваны і запячатаваны сябрамі Камісіі ў складзе: Шырмы Р., Марцінчыка М., Лукашэвіча Ул.

Пасьля збору, які закончыўся а 10 гадзіне ўвечары 21-га таго-ж сакавіка, усе 39 скарбонак агледжаны, пры чым, як самыя скарбонкі, так і плёмбы на іх аказаліся ўцэласьці і ў поўным парадку.

Камісія для падліку і праверкі вынятых са скарбонак грошай была ў такім складзе: Ст. Камітэту — І. Савіцкі і сябры Камітэту — Р. Шырмы і М. Пяткевіча.

Пасьля падліку і праверкі вынятых са скарбонак ахвяр — грошаў, вартасьць іх і агульная сума была спраўджана п. а. скарбніка Т-ва М. Пяткевічам.

№ скарб.	Сума ахвяр зл. гр.	№ скарб.	Сума ахвяр зл. гр.	№ скарб.	Сума ахвяр зл. гр.
1	16,19	14	49,69	27	14,60
2	22,80	15	19,14	28	15,83
3	25,70	16	34,70	29	6,37
4	2,66	17	11,44	30	4,89
5	33,96	18	18,24	31	8,75
6	30,24	19	20,30	32	3,65
7	27,46	20	17,65	33	8,69
8	34,64	21	16,36	34	7,34
9	11,71	22	14,90	35	6,34
10	31,21	23	3,24	36	1,85
11	7,98	24	10,41	37	9,06
12	22,80	25	7,63	38	13,02
13	8,55	26	13,14	39	2,22

Усяго збору з трыццаці дзевяці скарбонак на суму: шэсьцьсот пятнаццаць злотых 35 гр. Апрача таго ў чужаземнай валюце 2 сярэбран. манэты па 10 капеек расейскіх, 2 манэты гланскія—па 10 і 5 пфэнігаў, 2 манэты латвійскіх — 20 і 10 сантымаў, румынская 1 манэта—1 лея. Нямецкая 2 манэты — 25 пфэнігаў і 1 пфэніг.

Сябры Камісіі: **І. Савіцкі, Р. Шырма, М. Пяткевіч.**

Усе вышэйзазначаныя грошы атрымаў ад Камісіі п.а. Скарбніка Камітэту.

Усім асобам, прыняўшым удзел у зборы і ахвярадаўцам, Камітэт Помачы ахвярам вайны складае шчырае беларускае дзякуй.

Ўневажненьне выбараў. „Kur. Wil." падае вестку, што паўнамоцнік камуністычнага сьпіску ў Горадні выступіў з дамаганьнем уневажненьня выбараў у Сойм у Горадзенскай Акрузе.

З гэтакім-жа дамаганьнем выступіла партыя „Stronnictwo Chłopskie"

Магчымы разлом у П.П.С. У паведамлак 19.III г. г. адбылося паседжаньне варшаўскага камітэту П. П. С., які, як ведама, сымпатызуе ўраду. Пастаноўлена высылаць делегацыю да віцэ прэм'ера Бартля, якая ўзгоднілась-б рад асноўных пытаньняў у справе супрацоўніцтва з Урадам.

Дзеля таго, што Цэнтральны Камітэт П.П.С. стаіць на грунце апазіцыі да Ураду, трэба думаць аб паважнай магчымасьці глыбокіх церцяў у сярэдзіне П. П. С.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

І мы прабудзіліся.

(Вёска Залацева, Дзярэчынскай воласьці, Слонімскага павету).

Наша вёска Залацева доўгі час спала сном цемнаты, але, калі заладжыўся Гурток Т-ва Бел. Школы, мы пачалі патроху прабуджацца ад гэтага сну. Перадусім пры Гуртку мы заклалі бібліятэку-чытальню, каб маглі чытаць кнігі ў роднай мове. Пасьля пачалі ладзіць вечарыны-спэктаклі. Ня гледзячы на розныя перашкоды, як польскай адміністрацыі, а таксама некатарых нашых несьвядомых хлапцоў, — праца пайшла ўперад.

Ужо адбыліся тры спэктаклі: 1) 27.XI-1927 г. былі згуляны наступныя п'есы: „Конскі партрэт" і „Зьбянтэжаны Саўка", 2) 8.I-1928 г. — „Янка Канцавы" і „Суд", 3) 14.I-1928 г. — „Паўлінка" і „Лекары і лекі"; на ўсіх трох спэктаклях было публікі многа. Аматары-артысты свае ролі выканалі вельмі добра. Шчырая падзяка ўсім учасьнікам.

Вясковы А.

Асьвета шырыцца.

(Вёска Даўгінава, Ярэміцкай воласьці, Стаўпецкага павету).

З часу ліквідацыі „Грамады" наша вёска амаль да гэтага часу, можна сказаць, спала і не вяла ніякае працы на груньце асьветы і нацыянальнага ўсьведамленьня. Больш асьвечаныя жыхары нашай вёскі апынуліся за кратамі, як „камуністы", і дзеля гэтага культурна-прасьветная праца занякала.

Але, ня гледзячы на ўсе труднасьці і перашкоды, імкненьне да культурнага і нацыянальнага ўсьведамленьня расьце сярод моладзі.

Перад праваслаўнымі Калядамі некалькі хлапцоў з в. Даўгінава настанавілі залажыць беларускую бібліятэку-чытальню і набылі ўжо некалькі беларускіх кніжак з Выд. Т-ва ў Вільні. Найбольш у гэтай справе папрацаваў Хвёдар Варэнік, які зьяўляецца ініцыятарам залажэньня бібліятэкі і Міхал Тадэвушаў.

Гэты крок, зроблены малодшымі, павінны падтрымаць старэйшыя, каб бібліятэка не загінула дарма, без падтрыманьня. Я думаю, што даўгінаўцы зразумеюць, якое значэньне можа прынясьці ім бібліятэка і падтрымаюць яе. **Даўгінаўскі.**

На чорную дошку.

(Вёска Якубовічы, Берштаўскае гміны, Горадзенскага пав.).

У нашай вёсцы існуець Гурток Т-ва Бел. Школы. Сябры доўга стараліся дазволу на пастаноўку беларускага спэктаклю, але да гэтага часу ад Горадзенскага Старасты нічога ня чуваць. Перад Калядамі згаварыліся з польскім вучыцелём сумесна паставіць спэктакль польска-беларускі, можа, кажам, гэта паможа і стараста дазволіць. Усе, як адзін, сябры культурнай арганізацыі ахвотна зрабілі сцэну і сталі развучваць п'есы: пабеларуску „Суд", Галубка і папольску „Król Herod". Калі-ж прышоў час пастаноўкі, дык аказалася, што вучыцель ставіць толькі адну польскую п'есу. Артысты-Беларусы некаторыя адказаліся ад сваіх роляў і запратэставалі. Тады вучыцель замяніў іх другімі хлапцамі і ўсё-ж такі спэктакль адбыўся. Прад пачаткам спэктаклю наш сябра Янка Верабей, хацеў забраць сваю мэбель, якая была прынесена п. вучыцелем і яго наймітам Вінцуком Стасюкевічам на салю дзеля прыежджых паноў, бо ведама пры набіцьцю народа магла-б быць паломанай. Астатві ня даў крэслаў Вераб'ю, але яшчэ моцна пабіў яго за тое, нашто той дамагаўся сваей мэбелі. Спэктакль прайшоў кепска. У часе яго глядзельнікі шумелі, а шмат павыходзіла з салі. Па скончэньню, людзі сталі расходзіцца. Тады Вінцук Стасюкевіч (прадажнік) напаў на вуліцы на Я. Вераб'я, зноў моцна пабіў яго. Відаць, гэта рабілася супольна з вучыцелем, які ўсё бачыў, нічога не казаў, а толькі сьмяяўся. Варта адзначыць, што Вінцук Стасюкевіч лічыцца сябрам нашае культурнае арганізацыі, яму няма цяпер даверыя сярод нашае моладзі.

Прэч, юда, з ліку сяброў нашае культур. арганізацыі! Ты ня варт свайго імя, што: называюць цябе бацькі. Ты глумішся над сваім братам, табе месца ў панскім двары быць катам над жывёлай, бо ты ня лічышся з чалавекам. На чорную дошку гэтага вучня Паўлюкевічаўшчыны. Асьцерагайцеся яго сябры і нічога ня майце з ім супольнага. Па яго ініцыятыве грошы, сабраныя ад спэктаклю ў суме 70 злотых, былі прапітыя панкамі-вучыцялямі і ім, а мы за сваю работу, за сваю сцэну атрымалі што? Зьнявагу і гузоў на галаву, якія пад шапку не схаваюцца. Вось, браткі, як культура пашыраецца... **Невіша.**

Значэньне беларускіх радных.

Гурток Т-ва Бел. Школы ў в. М.-Галіку, Дзевяткаўскае воласьці, 17 сьнежня 27 г. падаў у валасную раду заяву, просячы дапамагчы бедным вучням у Беларускіх Гімназіях. На падставе гэтай заявы на валасным паседжаньні радны Лашко зрабіў даклад, высьвятляючы цяжкае палажэньне бедных беларускіх вучняў і аб неабходнасьці ў аказаньні ім дапамогі. Процім гэтага выступіў радны-абшарнік В. Сьвяціцкі, даводзячы недарэчнасьць, што гэта школы не панствовыя, што лепш дапамагчы пачатковым; а таксама ўсадзіў свой нос і пісар А. Немірскі (паляк), каб адкінуць гэтае пытаньне, пачаў зьбіваць радных рознымі падходамі, як то прапануючы, паслаць каго небудзь з свае воласьці вучыцца, а тагды даваць дапамогу, а не якім небудзь чужым, нам няведамым вучням, і адзін радны беларус С. гэтаму паддаўся, але ўсе астатнія дружна пашлі на спатканьне нашым прышлым інтэлігентам, на якіх пакладаем усе добрыя надзеі ў змаганьні за лепшую будучыню, і пастанавілі даць дапамогу ў суме 600 злотых, а 18-га студзеня г.г. падчас ухвалы бюджэту на 1928/1929 год зацьвердзілі, як аднаразовую дапамогу.

Дык вось, браточкі, з гэтага мы бачым, каму ня міла наша школа і наша навука. Але гдзе ёсьць наша большасьць і сьведамасьць у самаўрадах, там і наша перамога. Хай-жа кожны беларус памятае, якое мае вялізарнае значэньне, мець сваіх радных у валасных самаўрадах. **Падслухаў Сусед.**

З Т-ва Бел. Школы.

Працы Гурткоў.

✕ (В. Шэні, Пружанскага пав.). 12. III. 28 г. ў в. Шэні Гуртком Т-ва Бел. Школы быў зладжаны спэктакель-вечар, на якім былі адгуляны наступныя п'есы: „Ня разумам сьціміў, а сэрцам" пры добрым выкананьні аматараў-артыстаў, пасьля чаго была дэклямацыя і наканцы скокі.

✕ (В. Ярушічы, Слонімскага пав.). 9. I. 28 г. гуртом Т-ва Бел. Шк. быў зладжаны спэктакль-вечар, на якім былі адгуляны наступныя п'есы: „Боты", „Паўлінка" і „Пан Міністар". Нягледзячы на розныя перашкоды, як з боку несьвядомых беларусаў, так і адміністрацыі, п'есы былі адгуляны добра і глядзельнікаў было шмат. Падзяка ўсім Грамадзянам учасьнікам.

✕ Драматычнай сэкцыяй Петраневіцкага Г-ка Т-ва Бел. Шк. 22. I. 28 г. ў в. Петраневічы быў наладжаны першы беларускі спэктакль, на якім былі адыграны наступны п'есы: „Страхі жыцьця" і „Пасланец". Пасьля прадстаўленьня былі скокі. Нашы маладыя аматары-артысты ролі свае выканалі вельмі добра. Гурток Т-ва Бел. Шк. ў в. Петраневічах шчыра дзякуе ўсім тым, якія непашкадавалі сваіх высілкаў дзеля пастаноўкі спэктаклю.

✕ 25-га сьнежня 1927 г. Мала-Галіцкім Г-ком Т-ва Бел. Школы ў хут. Коміне, Дзевяткаўскае вол., быў наладжаны спэктакль-вечар, на якім былі адыграны п'есы: „Янка Канцавы"—К. Сваяка і „Выбары Старшыні" — Я. Быліны і 14 студня г. г. былі адыграны там-жа п'есы: „Суд" і „Гурток". Аматары-артысты свае ролі выканалі добра, асабліва добра адыгралі „Гурток". Дзяўчаткі з в. Грынкоўшчын на сцэну выступалі першы раз і выказалі вялікія здольнасьці. Саля была перапоўнена глядзельнікамі. Артыстам рабіліся цэлыя авацыі бурнымі воплескамі, што сьведчыць аб поўным задавальненьні глядзельнікаў. Даход са спэктакляў пашоў на бібліатэку-чыт. і 10% на пацярпеўшых ад стыхійных няшчасьцяў.

Гурток выражае шчырую падзяку грамадзяніну Марціну Лашко за памешканьне і за зробленыя матэр'яльных дапамогі.

Сябра суседа.

Пустацьвет.

Шкода паперы пісаць аб гэтым пустацьвеце, але каб ня скрыўдзіць свае душы, я павінен абарваць гэты цьвет і адкінуць яго далёка ад дрэва, каб ён не насіў жалю дрэву, якое пазваляе яму цвісьці намарна.

Вось служыць гэтаму прыкладу моладзь вёскі Цінцявічы, воласьці і павету Вялейскага. Адышліся яны далёка ад інтарэсаў сваей бацькаўшчыны і ня ведаюць самі, хто яны ёсьць. Хаўрус іх працуе што дня і вядзе барацьбу за вызваленьне „сінюшкі", так званай паіхняму „запяканкі". Адно шчасьце іхняе, каб танеі стала гарэлка, і каб даступна было ўсюды купіць яе, тады ў іх і будні дзень—сьвята. Накупляюць гусей, яек і робяць „закладзіныя" па некалькі дзён. Напіўшыся, падымаюць усю вёску на ногі, прыходзяць навет у хату да таго, на каго маюць злосьць, ну і пускаюць нажы, сьвінцоўкі і рэзіны ў ход, што навет за вярсту чуваць, як стогнуць і енчаць бабы, трымаючы сваіх сыноў.

Бедната ж пануе такая, што ў цэлай воласьці вёска Цінцявічы стаіць на першым мейсцы. Але калі падыходзяць „дзяды" асеньнія, дык поўны Куранець сена, саломы, дроў; кожны гарусьціць з астатняга на бутэльку „запяканкі", „дзядоў" ні адна вёска ня справіць такіх, бо ў іх бяз крыві не абойдзецца. Есьць там некалькі асоб і сьвядомых, але скольні яны не стараюцца прыцягнуць несвядомых, тыя ў лес глядзяць, як тыя ваўкі.

Дык браты Цінцявічцы, ці не пара палажыць крыж гэтай атруце, ці ня час ужо і вам глянуць у вакно, дзе відаць прамяньні сьветлай будучыні,—культуры.

Дось ужо быць прыкладам п'янства і разбойства. Павінны раз назаўсёды даць сабе клятву і не рабіць зла, а ўзяцца ўсім сіламі за працу, і тады вы ўбачыце сьвет. Дык да працы, браты, вас чакае жыцьцё лепшае будучыні. **Сусед.**

Песьня адзіноты.

Прайшлі, прагрымелі,
Закавалі цэлі.—
Ціш... ціш... ціш...
Сэрца б'е сэкунды,
Час паўзе, як сьліж.—
Ціш... ціш... ціш...
Задрыжэў званок,
Гэта звоняць нэрвы.—
Ціш... ціш... ціш.
Я слухаю цішу.
Мо' пачую што?—
Ціш... ціш... ціш...
На двары вясна,
Ужо сьнягоў няма...—
Ціш... ціш... ціш...
Сэрца б'е сэкунды,
Час паўзе, як сьліж,—
Ціш... ціш... ціш...

1928 г. **Хв. Ільляшэвіч.**

На прадвесьні.

Ускалыхнуліся ракі грудзі.
„Вясна будзе! Вясна будзе!"—
Кліч пачуўся у паветры,
Раскаціўся ў пушчы нетры
І дзесь згінуў... дзесь расплыўся...
А тут—новы нарадзіўся—
Усюды чуцён гул вясеньні.
Сонца яснага прамяньні
Усюды льлюцца, ўсё цалуюць.
Думку родзяць удалую,
Пачуцьці вясны зялёнай.
Гукі песьні аддалёнай
Там, за рэчкай, ціха таюць—
Усюды ўсё вясну вітаюць.
У грудзях чую моц каханьня
І шмат сілы да змаганьня
З яснай веснай заявілася —
Звонкай песьняю налілася,
Уздыхнулі лягчэй грудзі—
Вясна будзе! Вясна будзе!

14/III—1928 г. **Я. Дванаццаты.**

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу ветліва не адмовіць у надрукаваньні гэтых маіх некалькіх слоў „pro domo sua".

Рашуча заяўляю, што я ня пішу пад псэўдонімам Саўкі Барывоя і нічога супольнага з ім ня маю: ня ведаю навет, ці гэта праўдзівае прозьвішча, ці псэўдонім.

Хуліганскае выступленьне пана начальніка дый „акцызьніка" Ф. Умястоўскага („Беларускі Дзень" 1928 г. № 6) процім мяне носіць гэтакі ясны і вочавідны характар дэфэнзыўнага даносу, што прыходзіцца мне толькі віншаваць яго: ў новай прафэсіі „вялікім" начальнікам. Маю на гэта на'т цікавы дакумэнт у маім архіве!

Зьмест яго вось які: „панок" з акцызы Ф. Умястоўскі прасіў студэнта М. Грыгаровіча заявіць мне афіцыяльна, што калі я не вазьму назад свайго ліста, у каторым я запярэчыў факту рэдактарства і выдавецтва праз асобу Ф. Умястоўскага „Нашае Долі" (гл. „Права Працы" 1927 г. № 4) — дык ён, „панок", праз паноў начальнікаў Сухэнка ў Варшаве ды Кіртікліса ў Вільні зробіць гэтак, што мяне паганяць са службы і нігдзе ня прыймуць. Гэтую „страшную" пагрозу я прыняў да ведама, запратаколіўшы яе, як сьлед, пры подпісах М. Грыгаровіча і двох панятых.

За напісаньне ў л'сьце праўды—пагроза правакацыі! Што ж мне рабіць з гэтакім „вялікім" начальнікам, як „панок" Умястоўскі? Усе на сьвеце магчыма, дык хай-жа аб гэтым ведаюць людзі, што мае спаткаць маю скромную асобу!

Што рэдактарам і выдаўцам „Нашае Долі" быў толькі пан Ф. Умястоўскі, а ня хто іншы,—наш мілы „панок" усёткі не здалеў даказаць.

І падумаць толькі, як кажуць французы: tant de bruit pour une omelette! — а ўсё роўна, хоць бы на неба лезьці, няпраўды даказаць нельга.

Да гісторыі „Нашае Долі" прыбыло яшчэ некалькі стацей ў газэтах, з каторых пісаныя пяром п. Умястоўскага аж надта ясна сьведчаць аб яго кампрамітацыі, паясьненьняў, ці адказаў не патрэбуюць і астануцца ў гісторыі, як дакумэнты часу.

Пасьля ўсяго вышэйсказанага заяўляю, што на асабісыя зачэпкі маей асобы праз пана Ф. Умястоўскага адказываць ня буду, бо лічыў бы зьняважлівым для сябе самога ўступаць з ім у якія колечы палемікі.

Інж. Рамуальд Зямкевіч.

Ад Рэдакцыі. Зьмяшчаючы гэтае пісьмо, рэдакцыя дае магчымасьць паважанаму гр. Р. Зямкевічу выказацца ў справе брутальнай зьнявагі асабіста яго ў друку ды „падкрапленьня" сваіх аргумэнтаў праз такую пагрозу, як падана вышэй, праз п. Ф. Умястоўскага. Уносіць свае якія кольвечы корэктывы ў адносінах да „жывога трупа", якім зьяўляецца цяпер п. Ф. Умястаўскі, рэдакцыя лічыць непатрэбным, зазначаючы толькі, што С. Барывой ёсьць зусім іншая асоба, чым інж. Р. Зямкевіч, як піша аб гэтым п. Умястоўскі.

Рэдактар-Выдавец: Піліп Назарук.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.